# Дзень адкрытых дзвярэй анлайн

***У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А.Куляшова працягваюць праводзіць дні адкрытых дзвярэй у анлайн-фармаце. Падчас стрым-трансляцый абітурыентам падрабязна расказваюць аб сёлетняй уступнай кампаніі, спецыяльнасцях, перспектывах навучання.***

У мінулую суботу дзень адкрытых дзвярэй у рэжыме анлайн правялі на факультэце эканомікі і права ўніверсітэта. Факультэцкае жыццё выпускнікам школ прадставілі як адукацыйны і сацыяльны праект. Абітурыентам не толькі паведамілі пра спецыяльнасці, на якія будзе ажыццяўляцца набор, вучэбны працэс і навуковую дзейнасць, але і расказалі пра актыўных, неабыякавых людзей, якія вучацца і працуюць на факультэце. У якасці мадэратараў для дня адкрытых дзвярэй адміністрацыя факультэта выбрала двух сваіх студэнтаў, валанцёраў, якія ў перыяд пандэміі не засталіся абыякавымі і аказваюць дапамогу пажылым людзям.

На мерапрыемстве прысутнічалі дэкан факультэта, яго намеснікі, загадчыкі ўсіх кафедр. У патэнцыяльных абітурыентаў была магчымасць задаць любое пытанне і атрымаць на яго вычарпальны кампетэнтны адказ у рэжыме рэальнага часу.

Практыка правядзення дня адкрытых дзвярэй у анлайн-фармаце ва ўніверсітэце працягваецца.

**Ганна СІНЬКЕВІЧ.**
*magileu@nastgaz.by*